# ЗА ЎСІМ БАЧЫЦЬ ЧАЛАВЕКА

## Дзяржава і надалей будзе ўкладаць сродкі ў развіццё інфраструктуры і сацыяльных аб'ектаў

**Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў падчас рабочай паездкі ў Гомельскую вобласць. На чыгуначным вакзале ў Гомелі Прэзідэнт прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця рэгулярнага руху цягнікоў на электрычнай цязе па напрамку Гомель—Мінск—Гомель. Кіраўніку дзяржавы далажылі аб рабоце і планах па электрыфікацыі чыгуначных участкаў, што значна павышае эфектыўнасць грузавых і пасажырскіх перавозак, скарачае патрэбу ў паліўных рэсурсах і зніжае адмоўнае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе.**

Тут жа гаворка ішла аб рэканструкцыі і ўзвядзенні рэспубліканскіх аўтадарог аж да 2019 года. Усяго ў 2017—2019 гадах плануецца рэканструяваць і пабудаваць 616,7 км рэспубліканскіх аўтадарог. У іх ліку траса М6 Мінск—Гродна—мяжа Польшчы. Конкурс на выкананне работ выйграў беларускі падрадчык. Калі рэканструкцыя гэтай дарогі пакуль у планах, то новая сучасная траса Мінск—Гомель ужо завершана, пра што далажылі Прэзідэнту. Яе афіцыйнае адкрыццё плануецца прымеркаваць да надыходзячага Дня Незалежнасці.

Прэзідэнт з цеплынёй паразмаўляў з чыгуначнікамі і жыхарамі Гомеля, якія прыйшлі на мерапрыемства на прывакзальнай плошчы. «Дзе б я ні быў, што б ні рабіў, я заўсёды кажу — самае лепшае, што у нас ёсць, гэта людзі», — сказаў ён.

У Гомелі Аляксандр Лукашэнка таксама наведаў будаўнічую пляцоўку аб'екта па рэканструкцыі дзіцячай абласной клінічнай бальніцы. «Мы дамовіліся, што гэта будзе самая сучасная бальніца», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Асобныя даручэнні Аляксандр Лукашэнка даў у дачыненні да крыніц фінансавання будаўніцтва. Ён адзначыў, што ўздзельнічаць у гэтым павінны ўсе: і рэспубліканскі, і абласны, і гарадскі бюджэты, а таксама мецэнаты і бізнесмены.

Яшчэ адным пунктам праграмы рабочай паездкі стала наведванне СП ААТ «Спартак». «Я абсалютна не шкадую аб тых рашэннях, якія калісьці прыняў і вярнуў у рукі дзяржавы гэтыя прадпрыемствы, — заявіў Прэзідэнт, гаворачы пра лідараў кандытарскай галіны. — Я кіраваўся не нейкімі прыватнымі памкненнямі, а дзяржаўнымі інтарэсамі».

Аляксандру Лукашэнку далажылі аб вытворча-эканамічным, фінансавым стане і перспектывах развіцця прадпрыемства, а таксама аб рабоце кандытарскай галіны краіны ў цэлым. За мінулыя гады з моманту перадачы «Спартака» пад кантроль дзяржавы праведзена вялікая работа па рэканструкцыі і мадэрнізацыі прадпрыемства, павышэнні канкурэнтаздольнасці выпускаемай прадукцыі. Чакаецца, што ў бліжэйшыя два-тры гады фабрыка выйдзе на ўзровень лепшых аналагічных вытворчасцей.

Прэзідэнт падкрэсліў, што стабільная і эфектыўная работа такіх прадпрыемстваў, як «Спартак», у першую чаргу ўплывае на магчымасць фінансаваць праекты ў сацыяльнай сферы і развіццё інфраструктуры. «Мы будзем займацца інвестыцыямі ў развіццё інфраструктуры і сацыяльных аб'ектаў. Думаю, што за гэту пяцігодку мы канчаткова рэканструюем усю медыцыну і адукацыю. Ахова здароўя і адукацыя — гэта галоўнае», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, размаўляючы з калектывам «Спартака».

Кіраўніку дзяржавы таксама былі зададзены пытанні аб маючай адбыцца дэнамінацыі і цэнаўтварэнні, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

«Росту цэн у сувязі з дэнамінацыяй не будзе. Гэта я вам гарантую, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Мы за гэта адарвём галовы, калі хтосьці паспрабуе скарыстацца гэтым тэхнічным працэсам (гэта чыста тэхнічнае мерапрыемства)». Дзяржава таксама захавае кантроль над цэнаўтварэннем, але без залішняга ціску. У тым ліку з гэтай мэтай нядаўна падпісаны ўказ аб стварэнні Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

Прэзідэнт таксама падзяліўся сваім меркаваннем аб эфектыўнасці цэнтралізаванага тэсціравання, адзначыўшы дваякае стаўленне да такой формы экзамену. Відавочны плюс у тым, што, дзякуючы існуючай сістэме, удалося практычна цалкам выкараніць карупцыю і выключыць магчымасць паступлення за хабар. «Але не ўсе выдатнікі школы ў будучыні становяцца лепшымі прафесіяналамі. Пры тэсціраванні мы не бачым чалавека, не бачым палёту думкі, яго развaжанняў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы другі бок працэсу. «Думаю, нам не трэба зараз ні ад чаго адмаўляцца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, падкрэсліўшы, што сістэму трэба не ламаць, а «дапаўняць такім чынам, каб не страціць здольных і перспектыўных дзяцей». Прэзідэнт дадаў, што ў Беларусі падчас цяперашняй уступнай кампаніі пастараліся вырашыць праблему нестыкоўкі школьнай праграмы з заданнямі цэнтралізаванага тэсціравання.

Не засталася ўбаку і спартыўная тэма, у прыватнасці, чэмпіянат Еўропы па футболе, які праходзіць у Францыі. «Адсочваў асноўныя матчы. Не балею ні за каго. За футбол. І спрабую зразумець, у якім кірунку сягонння развіваецца футбол, — расказаў Прэзідэнт. — Я гляджу футбол з гэтых пазіцый. Гляджу, што ж трэба для таго, каб у нас футбол развіваўся, і што трэба для падрыхтоўкі нацыянальнай каманды».

■ Пра гэта сказана ў Праграме пяцігодкі

# Экалогія і эканоміка: дзе знайсці баланс?

**Паводле праекта Асноўных палажэнняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады, галоўная мэта дзяржаўнай экалагічнай палітыкі — стварэнне ўмоў для ўстойлівага выкарыстання прыродных рэсурсаў і зніжэння антрапагеннай нагрузкі на навакольнае асяроддзе. І сёння многія спецыялісты ўпэўнены — ажыццявіць гэтыя планы немагчыма без укаранення ў розныя сферы нашага жыцця прынцыпаў «зялёнай» эканомікі. Наколькі вялікі шлях у гэтай сферы ўжо прайшла наша краіна? Якія кірункі экалагізацыі эканомікі стануць асноўнымі ў найбліжэйшыя гады? На гэтыя і іншыя пытанні «Звязды» адказаў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй КАЎХУТА.**

***— Андрэй Марленавіч, «зялёная» эканоміка названая своеасаблівым рэгулятарам паміж экалагічнымі і эканамічнымі інтарэсамі краіны...***

— Беларусь разглядае гэты кірунак як стратэгічны метад рашэння сістэмных праблем, праблем захавання біяспекі прыродных рэсурсаў, занятасці насельніцтва, канкурэнтаздольнасці ў цэлым. «Зялёная» эканоміка актыўна развіваецца ў свеце. У яе аснове — інавацыйныя энергаэфектыўныя, альбо «зялёныя», тэхналогіі: яны кардынальна мяняюць прадукцыю, тэхналогіі і паводзіны спажыўца. Іншымі словамі, пры пераходзе на чыстыя тэхналогіі з'яўляюцца новыя рабочыя месцы, выпускаецца экалагічная прадукцыя, адпаведна паляпшаюцца здароўе насельніцтва і бізнес-клімат. Павялічваецца доля «чыстага», напрыклад электрычнага, транспарту. Да канца 2016 года мы распрацуем Нацыянальны план дзеянняў па ўкараненні прынцыпаў «зялёнай» эканомікі ў галіны народнай гаспадаркі Беларусі. Ён стане «дарожнай картай» для розных сектараў эканомікі і дазволіць выпрацаваць рашэнні, якія прывядуць да балансу паміж эканамічнымі і экалагічнымі інтарэсамі краіны.

***— Апошнім часам распрацавана некалькі праграмных дакументаў па экалагізацыі эканомікі Беларусі. Якія кірункі «зялёнага» развіцця краіны з'яўляюцца прыярытэтнымі? Якія «зялёныя» праекты ўжо дзейнічаюць у Беларусі?***

— Наша краіна максімальна зацікаўлена ў развіцці «зялёнай» эканомікі. Для вызначэння ўласнага шляху па экалагізацыі эканомікі Мінпрыроды рэалізуе некалькі праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Напрыклад, праект «Тэхнічная дапамога для падтрымкі развіцця «зялёнай» эканомікі ў Беларусі» накіраваны на ўдасканаленне прававых асноў развіцця «зялёнай» эканомікі, а «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да «зялёнай» эканомікі» рэалізуе практычныя мерапрыемствы. У рамках гэтых двух праектаў аналізуюцца і развіваюцца такія кірункі як дзяржаўныя «зялёныя» закупкі, экалагічныя інавацыі, сістэма экалагічнай маркіроўкі прадукцыі, арганічная сельская гаспадарка, экасістэмныя паслугі, экалагічны транспарт. Лічым перспектыўнымі «зялёнае» будаўніцтва, фарміраванне ўстойлівых «разумных» гарадоў, укараненне экалагічнага субсідавання, звязанага з адходамі вытворчасці, аднаўляльнай энергетыкай, транспартам.

Можна сказаць, «зялёная» мадэрнізацыя набірае тэмпы ў Беларусі, бо ўжо ажыццяўляюцца канкрэтныя меры па «азеляненні» эканомікі. Так, нядаўна ў заказніку «Налібоцкі» адкрылі гадавальнік для вырошчвання глушцоў. Ён дазволіць стварыць дадатковыя рабочыя месцы, штогод засяляць у дзікую прыроду да 45-70 птушак, прадаваць іх на беларускім і еўрапейскім рынках (раней мы не мелі магчымасці экспартаваць глушцоў), што дазволіць павялічыць папуляцыю ў іншых гадавальніках і аднавіць мікрапапуляцыю віду ў Еўропе.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

***— Арганічная сельская гаспадарка з'яўляецца адным з аспектаў «зялёнай» эканомікі. Калі ў Беларусі з'явіцца свой «арганічны» закон?***

— Сёння актуальнасць экалагізацыі сельскай гаспадаркі не выклікае сумненняў. Па ініцыятыве Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя летась урадам быў зацверджаны Нацыянальны план дзеянняў па прадухіленні дэградацыі земляў. У краіне пачалася комплексная работа над стварэннем механізму і неабходных прававых рамак для развіцця арганічнай сельскай гаспадаркі з улікам экалагічных складнікаў. Галоўную ролю ў гэтым працэсе іграе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Канцэпцыя закона «Аб вытворчасці і абароце арганічнай прадукцыі» ўжо адобрана, вядзецца работа над стварэннем праекта закона.

***— Згодна з Парыжскім пагадненнем, краіны свету паступова адмаўляюцца ад выкарыстання неаднаўляльных прыродных рэсурсаў на карысць чыстай энергетыкі. Ці павялічваецца ў Беларусі доля выкарыстання «зялёнай» энергетыкі?***

— Яшчэ 15 гадоў таму сектар аднаўляльнай энергетыкі быў прадстаўлены гідраэлектрастанцыямі, пераважна пабудаванымі ў часы СССР. У сучасным разуменні гэты сектар пачаў развівацца ў краіне адносна нядаўна. Сёння ў Беларусі дзейнічаюць больш за 650 установак па выкарыстанні энергіі сонца, ветру, натуральнага руху водных плыняў, біягазу, біямасы, цяпла зямлі — агульная магутнасць складае больш за 1000 МВт. Варта адзначыць, што пры росце выкарыстання аднаўляльных крыніц аб'ём атрыманай ад іх электраэнергіі ў агульным аб'ёме вытворчасці электраэнергіі ўсё яшчэ невялікі і, па звестках Белстата за 2014 год, склаў 134 млн кВт·гадзін, альбо каля 0,04% ад усяго аб'ёму электраэнергіі.

Да 2020 года доля вытворчасці першаснай энергіі з аднаўляльных рэсурсаў у Беларусі павінна складаць не менш за 6% у валавым спажыванні паліўна-энергетычных рэсурсаў. Летась у Беларусі была распрацавана Канцэпцыя энергетычнай бяспекі Беларусі на перыяд да 2035 года. Значная ўвага ў гэтым дакуменце ўдзяляецца аднаўляльным крыніцам энергіі. У адпаведнасці з прынятай канцэпцыяй, да 2035 года вытворчасць электраэнергіі з выкарыстаннем аднаўляльных крыніц энергіі павінна складаць не менш за 2,6 млрд кВт·гадзін у год.

**Кацярына РАДЗЮК**

# У ЖЫЛКАМГАСЕ ЗДАРОВАЙ КАНКУРЭНЦЫІ НЕ БАЯЦЦА

**Жыллёва-камунальнай сферы ў праекце Асноўных палажэнняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады прысвечаны цэлы раздзел. Пэўная ўвага там удзяляецца далейшаму развіццю рынку арэнднага жылля, комплекснай аўтаматызацыі і дыспетчарызацыі аб'ектаў гэтай гаспадаркі, прыцягненню ў сферу абслугоўвання і рамонту жыллёвага фонду арганізацый рознай формы ўласнасці і іншым важным кірункам. Як гэтыя палажэнні праграмы будуць выконвацца на практыцы, мы спыталіся ў намесніка міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзя ТРУБІЛЫ.**

## ЯШЧЭ 70 ТЫСЯЧ АРЭНДНЫХ КВАТЭР

— Увядзенне платы за карыстанне камерцыйным дзяржаўным жыллём (сёлета з 1 ліпеня) мае дакладна акрэсленыя мэты, — тлумачыць Генадзь Трубіла. — Атрыманыя грошы акумулююцца ў спецыяльным фондзе і надалей будуць выкарыстоўвацца толькі для будаўніцтва менавіта арэнднага жылля і мадэрнізацыі дзеля гэтых мэт іншых аб'ектаў дзяржаўнага жыллёвага фонду. А ўвогуле такое жыллё нашай дзяржаве патрэбна, каб зняць праблему пераезду людзей на месца сваёй новай працы. Каб нашы грамадзяне не шукалі часам даволі дарагія кватэры ў прыватнікаў, а былі ўпэўнены, што якаснае жыллё па даступных цэнах ім прапануе дзяржава. Заўважу, што цяпер у дзяржаўным сектары стаўкі па арэндзе прыкладна ўдвая ніжэй падобных цэннікаў у прыватнікаў.

А сур'ёзны попыт на такое жыллё, галоўным чынам, маецца сёння з боку вузкіх спецыялістаў (настаўнікаў, урачоў, інжынераў вытворчай сферы і іншых), якія атрымалі запрашэнне на працу ў іншы рэгіён. Развіццё гэтага кірунку вырашыць праблему свабоды руху і свабоды працоўнай міграцыі на тэрыторыі ўсёй краіны. Напрыклад, у Мінску цяпер ёсць каля 5,5 тысячы кватэр арэнднага жылля, з якіх прыкладна 2 тысячы кватэр было пабудавана ў апошнія гады. Тут адзначу, што па нашых папярэдніх падліках, пасля 1 ліпеня ў ранг арэнднага жылля ў краіне трапіць мінімум каля 70 тысяч кватэр, якія так і не будуць прыватызаваныя насельніцтвам.

## ДЫСТАНЦЫЙНАЕ КІРАВАННЕ

— Так, нашы службы будуць і надалей працягваць комплексную дыспетчарызацыю сваіх аб'ектаў. Гэта даволі важная задача. Ужо цяпер у нас ёсць цеплавыя вузлы, абсталяваныя такой аўтаматыкай, якая дазваляе спецыялісту больш дакладна бачыць сітуацыю і кіраваць ёю праз пульт дыспетчара. Такім чынам скарачаецца колькасць персаналу (так званых абходчыкаў) па кантролі за паступленнем цяпла, вады, помпавых станцый і іншага абсталявання. Увядзенне гэтай сістэмы дазволіць абслугоўваць жыллёвы фонд краіны меншай колькасцю работнікаў, больш якасна і больш танна для канчатковага спажыўца. У Мінску такая сістэма ўжо дзейнічае.

## УСЁ — ПА КОНКУРСЕ

— Адзначу і тэму ў палажэнні Праграмы, якая тычыцца прыцягнення ў нашу сферу прыватных арганізацый. Ужо сёння ў Мінску дзейнічае служба заказчыка. Гэта прадстаўнікі насельніцтва, якія арганізуюць працэс абслугоўвання як жыллёвага фонду, так і прыдамавой тэрыторыі. Гэта паслуга мае свой кошт. Арганізаваная служба аб'яўляе конкурс, на якім у якасці лота выстаўляецца такая паслуга. У конкурсе разам з дзяржаўнымі камунальнымі службамі ўдзельнічаюць і прыватныя структуры. Напрыклад, сёння прыватныя арганізацыі паспяхова ажыццяўляюць розныя рамонтныя работы, у тым ліку і капітальны рамонт будынкаў. Надалей мы прагназуем, што служба заказчыка будзе праводзіць конкурсы і на выбар падраднай арганізацыі для ўборкі прыдамавой тэрыторыі і пад'ездаў, па нейкім іншым тэхнічным абслугоўванні жыллёвага фонду. Выкарыстанне механізма конкурсаў стане здаровай канкурэнцыяй для ўжо дзеючых служб.

## «АД ЛІФТА»

— Цяпер перад намі стаіць задача замяніць і мадэрнізаваць за пяцігоддзе больш чым 11 тысяч ліфтаў, якія адпрацавалі нарматыўныя тэрміны эксплуатацыі. Задача сапраўды складаная, але выканальная. Больш за тое, яе неабходна выканаць абавязкова. У нас дзейнічае тэхнічны рэгламент Мытнага саюза, у якім гаворыцца, што да 2020 года неабходна замяніць усе ліфты, тэрмін эксплуатацыі якіх скончыўся. Нагадаю, што тэрмін эксплуатацыі ліфта складае 25 гадоў. А ў нашым жыллёвым фондзе яшчэ ёсць ліфты, якім больш за 30 гадоў, і яны працягваюць «ездзіць». Выканаць гэтую праграму ў поўным аб'ёме будзе крыху праблематычна з фінансавай прычыны. Справа ў тым, што ў нашай краіне замена ліфтаў фінансуецца выключна з бюджэту, што сёння не зусім лагічна. Асабліва гэта тычыцца тых дамоў, дзе доля прыватызаванага жылля складае 100%.

— Што тычыцца непасрэдна наяўнасці ліфтаў для замены, то іх у айчынных вытворцаў цяпер дастаткова, — упэўнены Генадзь Трубіла. — Падобны заказ цалкам можа выканаць наша прадпрыемства «Магілёўліфтмаш».

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*